# СПЕЦЫФІКА СУЧАСНАЙ СІСТЭМЫ МАСТАЦКАЙ АДУКАЦЫІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

***В. У. Рагачова,***
*дацэнт кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

Сучасная сістэма мастацкай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, якая стваралася і ўдасканальвалася на працягу многіх стагоддзяў, абапіраецца на асноўныя дзяржаўныя дакументы – Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і Закон «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь», якія вызначаюць перспектывы яе развіцця ў адзінстве мэт, задач і шляхоў іх рэалізацыі.

Пад тэрмінам *мастацкая адукацыя* прынята разумець працэс авалодання чалавекам мастацкай культурай свайго народа і чалавецтва, адзін з найважнейшых спосабаў развіцця і фарміравання цэласнай асобы, яе духоўнасці, творчай індывідуальнасці, інтэлектуальнага і эмацыянальнага багацця [1].

Асноўнымі мэтамі мастацкай адукацыі на сучасным этапе з'яўляюцца павышэнне ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў у сферы мастацкай культуры, захаванне і развіццё адпаведнай сістэмы ўстаноў, якая склалася ў Беларусі. Зыходзячы з прадстаўленых мэт, мастацкая адукацыя забяспечвае ажыццяўленне наступных задач: фарміраванне і развіццё эстэтычных патрэб і густаў розных груп насельніцтва; падрыхтоўку творчых кадраў да прафесійнай дзейнасці ў сферы мастацкай культуры, а таксама педагагічных кадраў для сістэмы мастацкай адукацыі; далучэнне насельніцтва Рэспублікі Беларусь да каштоўнасцей айчыннай і замежнай мастацкай культуры; выяўленне мастацка адораных дзяцей і моладзі, стварэнне адпаведных умоў для іх адукацыі, творчага развіцця і інш.

Рэалізацыя пералічаных мэт і задач звязана з неабходнасцю рашэння сучасных праблем у галіне культуры, якія, у сваю чаргу, адлюстроўваюць перажываемыя беларускім грамадствам цяжкасці ў эканоміцы і сацыяльнай сферы. Да такіх спецыфічных праблем адносяцца:

– недаацэнка ў сацыяльнай практыцы ролі эстэтычнай свядомасці, мастацкай культуры як уплывовых фактараў развіцця асобы і грамадства;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– каштоўнасці высокага мастацтва і іх роля ў культуры ставяцца большай часткай сучаснай моладзі пад сумненне або нават зусім адмаўляюцца;

– узмацненне разрыву паміж масавай школай і высокай культурай, якая набывае ўсё больш элітарны характар;

– другарадная роля, якая адводзіцца прадметам мастацка-эстэтычнага цыкла ў агульнай адукацыі на ўсіх яе этапах.

Пераадоленне існуючых супярэчнасцей і знішчэнне вострых праблем, якія стаяць перад грамадствам, з’яўляюцца састаўной часткай тых мэт і задач, якія стаяць перад нацыянальнай сістэмай мастацкай адукацыі.

Змест і метадалагічныя прынцыпы мастацкай адукацыі павінны адпавядаць актуальным задачам развіцця беларускага грамадства, сусветнага культурнага працэсу, спрыяць усебаковаму задавальненню духоўных запатрабаванняў асобы. Так, змест мастацкай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь уключае: фарміраванне культурна-гістарычнай кампетэнтнасці, якая прадугледжвае вывучэнне тэорыі і гісторыі мастацтва розных эпох і народаў; фарміраванне мастацка-практычнай кампетэнтнасці, якая прадугледжвае авалоданне сродкамі мастацкай выразнасці розных відаў мастацтва; фарміраванне мастацкага густу і ацэначных крытэрыяў у кантэксце духоўна-маральных і эстэтычных ідэалаў.

У сваю чаргу, рэалізацыя зместу мастацкай адукацыі адбываецца на трох узроўнях:

1) фарміраванне адносін да культуры як да важнейшай умовы свабоднага і рознабаковага развіцця асобы;

2) фарміраванне патрэбнасці ў паўнавартасных мастацкіх зносінах з творамі розных відаў мастацтва на аснове іх адэкватнай эстэтычнай ацэнкі;

3) фарміраванне навыкаў самастойнай мастацкай дзейнасці, успрымання гэтай дзейнасці як неад’емнай часткі свайго жыцця.

Для кожнага этапу мастацкай адукацыі некаторыя яго бакі выступаюць як дамінуючыя, вядучыя, іншыя ж, як дадатковыя і спадарожныя, прычым важную ролю тут адыгрываюць узроставыя асаблівасці. Так, у дашкольным узросце галоўнае – фарміраванне эстэтычных адносін да навакольнага свету, якое ў асноўным ажыццяўляецца праз сінкрэтычны характар мастацкай праявы дзіцяці, арганічна ўпісаныя ў яго ўласную жыццядзейнасць. У пачатковай школе фарміруюцца базавыя асновы, набываюцца першасныя звесткі, на глебе якіх у далейшым складзецца як сістэма

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эстэтычных ведаў, так і ўласныя мастацка-практычныя навыкі дзіцяці. У агульнаадукацыйнай сярэдняй школе падлеткі авалодваюць мовай розных відаў мастацтва, што дае ім магчымасць самастойнага спасціжэння твораў мастацтва, а таксама стварае перадумовы для ўласнай мастацкай дзейнасці. І, нарэшце, у сярэдніх спецыяльных і ўстановах вышэйшай адукацыі маладыя людзі прыходзяць да паўнавартаснай сацыяльна-культурнай самаідэнтыфікацыі, усведамляючы сваю прыналежнасць да пэўнага культурнага слоя з яго адмысловымі мастацка-эстэтычнымі ўяўленнямі і густамі, на аснове якіх складаюцца пэўныя прыярытэты і ва ўласнай мастацкай творчасці незалежна ад яе прафесійнай або аматарскай накіраванасці.

У кантэксце сказанага правамерна прывесці метадалагічныя прынцыпы, якія з'яўляюцца асновай для засваення зместу мастацкай адукацыі: пачатак навучання з ранняга ўзросту, бесперапыннасць і пераемнасць розных узроўняў мастацкай адукацыі; мультыкультурны падыход, які прадугледжвае ўключэнне ў праграмы па мастацтве максімальна шырокага дыяпазону мастацкіх стыляў і нацыянальных традыцый з абавязковай апорай на айчынную культуру; апора на нацыянальна-культурныя асаблівасці пры складанні навучальных праграм па прадметах мастацтва; комплексны падыход да выкладання мастацкіх дысцыплін на аснове ўзаемадзеяння розных відаў мастацтва; распаўсюджанне варыятыўных адукацыйных праграм рознага ўзроўню, адаптаваных да здольнасцей і магчымасцей кожнага навучэнца; укараненне асобасна арыентаваных методык мастацка-адукацыйнай дзейнасці, індывідуальных падыходаў да кожнай катэгорыі навучэнцаў.

На сённяшні дзень у сістэму мастацкай адукацыі ўваходзяць эстэтычнае выхаванне, агульная мастацкая адукацыя і прафесійная мастацкая адукацыя. Рэалізацыя праграм мастацкай адукацыі ажыццяўляецца ва ўсіх тыпах і відах адукацыйных устаноў, такіх як дзіцячыя сады, агульнаадукацыйныя школы, установы сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай і паслявузаўскай прафесійнай адукацыі, ва ўсіх установах дадатковай адукацыі, у тым ліку і дзіцячых школах мастацтваў. Немалаважную ролю ў мастацкай адукацыі адыгрываюць установы культуры і мастацтва. Структуру мастацкай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь можна прадставіць у выглядзе своеасаблівай піраміды: у яе аснове – пачатковае звяно (523 навучальныя ўстановы: музычныя, харэаграфічныя, тэатральныя і школы мастацтваў); затым ідуць сярэднія спецыяльныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навучальныя ўстановы (ліцэяў, каледжаў, гімназій – 21), у тым ліку тры ўстановы рэспубліканскага і 18 мясцовага падпарадкавання; на вяршыні піраміды функцыянуюць тры ўстановы вышэйшай адукацыі (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі і Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў) [3].

Пачатковае звяно сістэмы ахоплівае цэлую сетку дзіцячых школ мастацтваў рознай накіраванасці: музычныя, мастацкія, харэаграфічныя, фальклорныя і інш. [3, с. 75]. Па дадзеных на 2010 г. размеркаванне па напрамках выглядала наступным чынам: школы мастацтваў – 295; музычныя школы – 178; мастацкія школы – 25; харэаграфічныя школы – 9; іншыя кірункі (народныя рамёствы, народны танец і інш.) – 16.

Прадстаўленыя ўстановы ажыццяўляюць комплекснае эстэтычнае навучанне і выхаванне дзяцей, забяспечваюць набыццё пачатковых навыкаў прафесійнага майстэрства. Дамінаванне колькасці ДШМ адлюстроўвае станоўчую тэндэнцыю пераўтварэння вузкапрофільных школ у школы мастацтваў, за апошнія гады іх колькасць вырасла [2]. Аднак, нягледзячы на тое, што адбылася пэўная структурная перабудова, існуючая сетка навучальных установ пачатковага звяна не зусім адпавядае патрэбам грамадства. Так, у Рэспубліцы Беларусь гістарычна склалася сістэма з відавочным «ухілам» у бок музычнай адукацыі. З прычыны гэтага праца на сучасным этапе павінна быць накіравана на развіццё харэаграфіі і тэатразнаўства. Аналагічныя тэндэнцыі ўласцівы і сетцы навучальных установ сярэдняга звяна мастацкай адукацыі.

Такім чынам, можна зрабіць выснову аб тым, што ў рэспубліцы функцыянуе дастаткова разгалінаваная сетка ўстаноў, якія займаюцца працай з адоранымі дзецьмі і моладдзю. Дадзеная сетка прадстаўлена на трох асноўных узроўнях: пачатковая, сярэдняя і вышэйшая адукацыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

1. Аб выніках работы ўпраўленняў культуры аблвыканкамаў і Мінгарвыканкамаў у 2010 годзе. – Мінск : [б.в.], 2011. – 39 с.

2. Аттестация педагогических работников в учреждениях культуры / Министерство культуры Республики Беларусь, УО «Белорусский государственный университет культуры и искусств», Институт повышения квалификации и переподготовки кадров / сост. Т. М. Бунтовская. – Минск : Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2009. – 101, [1] с.

3. Беларуская культура сёння : гадавы агляд, 2009 / А. М. Бязуглы [і інш.] ; пад агул. рэд. Т. І. Стружэцкага. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2010. – 148 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ